П85



Пятро Прыходзька

# Бярозавы лісток

Вершы

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2004

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-5
П85

Мастак У. І. Сытчанка

*Для малодшага школьнага ўзросту*

ISBN 985-02-0689-6

© Прыходзька П. Ф., 2004
© Афармленне. ВРУП «Мастацкая літаратура», 2004



## МАЯ ЖАЛЕЙКА

Я хачу сыграць удала
На жалейцы на сваёй.
І вялікі наш Купала
Ў свет выходзіў разам з ёй.

Хай лясныя адгалоскі
Прагучаць у песні ўсім,
Абуджу сон роднай вёскі
Звонкім граннем я сваім.

На шырокае раздолле
Клічу ўсіх я, на прастор,
Дзе калоссем спее поле,
Ў небе ззяюць іскры зор.

Воляй лёсу я самога
На ўвесь век жалейку ўзяў,
Каб вяла мяне дарога
Да святла жыццёвых з'яў!







## КУСТ ЯЗМІНУ

Здавалася, язмін аджыў
Свой век у плыні зім і летаў.
Паміж маліны і ажын
Не расцвіце ўжо новым цветам.

Пасохлі кветкі па адной,
І кусцік стаў якісь нясмелы.
Не загарыцца больш вясной
Яго агеньчык ярка-белы.

Але прыйшла вясна — і зноў
Ажыў пад сонцам куст язміну,
З ягоных сочных каранёў
Шмат новых прарасло галінак.

Ён ад зямлі набраўся сіл
І расквітнеў на ўскраі вёскі.
Нібы пушынкі ў птаха з крыл,
Зноў долу падалі пялёсткі.

## НА НАЧЛЕЗЕ

*(Верш, адноўлены з памяці маленства)*

Я пры дзеда дапамозе
Ўпершыню ўзлез на каня
І памчаўся па дарозе
На начлег — да ўсходу дня.

Конь трушком па шляху скача,
Капытоў кладзецца след.
Першы раз я сёння ўбачыў,
Што прыгожы вельмі свет.

Як дарослыя, і я так
На начлезе ўсё рабіў:
Абыходзіў конскі статак,
Сучча на касцёр насіў.





Быў упэўнены, што ў лесе
Не заблудзіцца мой конь.
Саграваў цяплом, як песняй,
Нас — начлежнікаў — агонь.

Добра мне было маломy
Вадзіць коней на начлег.
А на золку зноў дадому
Конь мой рыжы шпарка бег.



# НА ЎСКРАІ ВЁСКІ

Гуменца птушкамі абжыта
Ля самай вёскі, на ўскраі.
Сноп абмалочанага жыта
Абселі дружна вераб'і.

Шукаюць каласкоў вусатых
І штосьці дзюбкамі дзяўбуць.
Іх — жыхароў зямлі крылатых —
Саломкаю не спадмануць.

Яны сюды з садка ля хаты
Свой недарэмна бралі ўзлёт:
Яшчэ ёсць дзе-нідзе зярняты,
Дзе вёўся жыта абмалот.



## СІНІЧКА-СЯСТРЫЧКА

Толькі ўзыдзе сонца —
Я гляджу ў аконца.
І зусім не плачу,
Як сінічку ўбачу.

Летам і зімою
Тут яна са мною.
Двор не пакідае,
Песеньку спявае.

Не ляціць за мора
З роднага прастору.
Будзь са мной, сінічка,
Як мая сястрычка.

Мне сказала мама,
Што ў мяне таксама,
Нібы зоркі ўночы,
Сіненькія вочы.



## КАЧАНЯ

Я з дазволу мамы, таты
На раку, дзе гай шуміць,
Сёння ўранку выйшаў з хаты
Дзікіх качак пакарміць.

Толькі ў рукі ўзяў калачык —
І адразу ў бліках дня
Бачу: між дарослых качак
Тут малое качаня.



Каля берага крутога
Птахаў цэлая сям'я.
Крохі хлебца для малога
Перш за ўсё кідаю я.

Сонца промнямі іскрыцца
У рацэ на самым дне.
Качаня ўзмахнула крыльцам,
Шчыра дзякуючы мне.



# ДЗІМА І ЦЁЦЯ ВАЛЯ

Цёцю Валю любіць Дзіма —
Не праходзіць хаты міма,
Дзе яна жыве на дачы
І жадае ўсім удачы.
Цёця ўсіх дзяцей шануе
І заўсёды іх частуе
І цукерачкамі з крамы
І сваімі піражкамі.
А сягоння ў цёці Валі
Нараджэння дзень — сказалі.
Толькі гэты дзень пачаўся —
Дзіма ўстаў і ў сад падаўся.
Не заўважыла нат мама —
Нарваў кветак лепшых самых,
І пакуль шчэ ўсе не ўсталі —
Уручыў іх цёці Валі.







## ДВА МАСТАКІ

У садку дзіцячым зранне
З сшытка школьнага ліСткі
Узялі для малявання
Два малыя мастакі.

На адным лістку паперы
Ў Пеці выйшаў не пугач:
Ён малюе, як воўк шэры
Даганяе зайку ўскач.



Коля кажа: — Бег я чую
Ў тым, што ты намаляваў.
Ды такога не хачу я,
Каб воўк зайку даганяў.

Намалюй асобна зайку
На другім зусім лістку,
Што спяшае на зарадку —
Не дагнаць яго ваўку!







## САБАЧКА МІКІ

Мой сабачка Мікі —
Пудзялёк патомны.
Ростам невялікі,
Ды ў хадзе нястомны.

Любіць у спакоі
Паляжаць дзе з краю.
У сваім пакоі
Ўсё сам прыбірае.



Мячык і нажніцы
Цягне з-пад канапы.
Блюдца для вадзіцы
Перасуне лапай.





Тапачкі ў гасцінай
Можа вам паднесці:
Ўсё ляжаць павінна
На належным месцы.



Шчотачку ён можа
Ўзяць з палічкі лоўка,
Каб яму прыгожа
Расчасаць галоўку.

Часта на прыродзе
Мікі наш бывае.
З намі ў добрай згодзе
Там адпачывае.



Любіць лета, восень
І лясное рэха.
Ды не пераносіць
Ён чужога брэху.

## ХАЦЕЛАСЯ Б МНЕ...

Хацелася б мне ўсё ісці безупынку
Між родных палёў і бароў.
Адрозніць змагу я любую мясцінку —
Дзе ўзгорак, палянка ці роў.

Дзядуля калісьці ад краю да краю
Праходзіў па ўсёй старане.
Страчала Радзіма яго дарагая —
Героем ён быў на вайне.

Хацелася б мне, каб пажоўклай лістотай
Мяне лістапад укрываў,
І я свайму краю не моўчкі, не ўпотай
Свой шчыры паклон адбіваў.

Ноч летняя ўкрыла палеткі, пагоркі,
А ў небе прыгожа наўздзіў
Іскрацца прамені той вогненнай зоркі,
Што дзед на пілотцы насіў.





1/4887/9440
...ТЫМСКАЯ
РАЙОННАЯ
ЦЕНТРАЛИЗОВАНН...
СИСТЕМА БИБЛИОТЕ...



# ШПАК І ПАРЭЧКА

Павінна быць і ў зайца радасць
Перад халоднаю зімой.

*Уладзімір Караткевіч*

Сад у засені галінак
Па-над самай рэчкай.
Ёсць тут вішні і маліны,
І агрэст з парэчкай.

Раніцой з бярозкі белай,
Што расой іскрыцца,
Шпак на куст парэчкі спелай
Хуценька садзіцца,

Ласавацца пачынае
Ягадкамі ў садзе,
Ды зялёных не кранае,
Што ў яго паглядзе.

Выбірае толькі тыя,
Што для ежы гожы,
Нібы зоркі залатыя,
Свецяцца прыгожа.

Шпак таксама прагне волі,
Як усе на свеце.
Тут жа ўсё жыве ў суполлі —
Сад, на дрэвах веце.

А суседка мне з-за рэчкі
Крыкнула басіста:
— Прагані шпака з парэчкі —
Паклюе ўсю чыста!

Ці ж не бачаць сэрца, вочы
У маёй суседкі,
Што і шпак жа есці хоча
І ў яго ёсць дзеткі.

Ціха я стаю між кветак,
Толькі назіраю:
Ягадак хай і для дзетак
Шпак тут назбірае.

І яму і птушанятам
Будзе на сняданне.
І нічога каля хаты
Больш кляваць не стане...





# МУХА-КРАДЗЮХА

Дзе цукар, малако, мядуха,
Заўсёды муха там, крадзюха.

І хто дзе мяса пакладзе —
Яна хоць крыху ды ўкрадзе.

І ў садзе, дзе на дрэвах мошкі,
Не ўступіць муха ім ні крошкі.

У птушкі крала з-пад пяра,
Як і расінку ў камара,

У павука, што кросны тчэ,
Хацела ўкрасці штосьці яшчэ.

Ды канчаткова на галіне
Заблыталася ў павуціне.



## МАМАРАТНІК



У дзяцей усіх, вядома,
Змалку ёсць прызванне:
Ў школе, у садку і дома
Любяць маляванне.

І Алесю змалку мама
Маляваць вучыла
Дрэвы, птушак, а таксама
Кветкі, што любіла.

Вось кусток лісточкі вяжа,
Быццам крыльцы птушцы.
— Гэта папаратнік,— кажа
Мама так дачушцы.—

Яго людзі ўшанавалі
Як папарàць-кветку,
Што квітнее на Купалле
Адзін раз улетку.

— Чаму ж кветак гэткіх мала? —
Дзівіцца Алеся.—
Ну а мамаратнік, мама,
Ці ёсць у тым лесе?

## ДЗЯДУЛЕВЫ ЗГАДКІ

У думках, нібы птах крылаты,
Ляціць дзядуля над зямлёй,
Зноў у юнацкі свет багаты
Вярнуўся з восені сваёй.

Прыгадвае былыя вёсны,
Апавядае, як уздоўж
Рачулкі бегаў сцежкай роснай
Ля роднай вёскі басанож.

Ён помніць, як сябры і школа
Радзімы азаралі лёс
І ззяла ўсё святлей наўкола,
Нат зоркі ў вышыні нябёс.

Бабуля ў ласкавай замове
Яго будзіла ў ранні час,
І ў школе ён на роднай мове
Чытаў у кнізе дзіўны сказ



Пра тое, як «Гусляр» Купалы
Не толькі граў сваім панам,
А з даўніны сцяг волі, славы
Ўсім асвятляў дарогу нам.

Дзядуля мой заўжды ў паходах
Нястомным быў у барацьбе,
Каб пераджыць усе нягоды
І сеяць шчасце на сяўбе...

І я шпакам раблю дамоўкі,
Кліч падаю сваёй вясне,
Каб мужным, смелым, ва ўсім лоўкім
З маленства быць заўсёды мне.





## ДЗВЕ МАЦІ

Я быў яшчэ зусім маленькі,
Як маці родную хавалі:
Не чуў, як людзі па тры жменькі
Пясочку на труну кідалі.

Мяне пасля ў царкву ў мястэчка
Браў мой дзядуля на прычасце.
І я з ім побач ставіў свечку
Там за спачын радзімай маці.

Душа належала зямлі ўся,
Не знаючы ў жыцці прымусу.
Маці Марыі я маліўся,
Што нам дала Хрыста Ісуса.

Навек з дзіцячае пары́ я
Запомніць змог хвіліны тыя,
Бо і маю ж маму Марыяй
Бацькі назвалі ў дні святыя.

І дзве тады перада мною
Былі наяве родных мамы:
Адна — ўжо ўзятая труною,
Другая — ў яркім святым Храме.

І ўсюды сёння, дзе б ні быў я,
Сваёй Радзімай ганаруся,
За ўсіх дзяцей у дні любыя
Абедзвюм мамам я малюся.



## БЛІЗНЯТКІ

Дзве дзяўчынкі-весялінкі
Ў адной мамачкі растуць.
Як пралескі, дзве дзяўчынкі
Сінявокія цвітуць.

Гэтак модна і прыгожа
Адзявае мама іх,
Што ніхто ніяк не можа
Вылучыць адну з дваіх.

Прыгажосць і дух бадзёры
Даў ім лёс на ўсе гады.
І пра іх усе гавораць:
Як дзве кропелькі вады!..





## ЗІМОВЫ ВЕЦЕР

Зноў прыкрыляў зімовы вецер,
Зрабіўшы ўсёй зямлі аблёт.
На дрэвах ён гайдае веццe,
Сняжынкі сыпле нам на плот.

Здалёку ён, з чужога краю
Сам адшукаў дадому шлях,
Бялюткім пухам усцілае
Рунь маладую на палях.

Ён намяце сумёты снегу —
І недзе ў пушчы ціха спіць,
Каб лепей нам на лыжах бегаць
І бабу снежную ляпіць.



# САРОЧЫНКА

Хмарка ў небе наплывае,
Надышла залева.
А сорочынка малая
Ўпала долу з дрэва.

Мо сарока-маці з лёту
Не прынесла ежы?
І яна ляжыць ля плоту
Пад сасной на ўзмежжы.

Але вецер хмарку злую
Адганяе ў далі.
Мы сарочынку малую
З долу падабралі.

Напаілі, накармілі
Ў нашым цёплым доме,
Нат гняздзечка ёй зрабілі
Ў кутку на саломе.

Ўсе глядзелі каля хаты
На яе ў здзіўленні:
Доўгі хвосцік чарнаваты
Ў белым апярэнні.

Сарочынку шчырым сэрцам
Дзеці палюбілі,
Многаму яе, здаецца,
Самі навучылі:



Яна першай раным-рана
Да садка ляцела,
І сама вадзічкі з крана
Там папіць умела.

Бы вядзе сябе прыстойна
Птушка на ўздарожжы,
Ды хвілiначкі спакойна
Пасядзець не можа.

Для яе ўсяго хапае —
І вады і хлеба,—
А яна ўсё паглядае
Кожны раз у неба.

Ад яе мы ані кроку,
Ўсё даём, што хоча.
Яна ж чуе, як сарока
У бары стракоча.

І туды зноў, у свет белы,
З усяго размаху
Узяла напрамак смелы
Ў сям'ю вольных птахаў.



29754
ХОТИМСКАЯ РАЙОННАЯ ЦЕНТРАЛИЗОВАННАЯ СИСТЕМА БИБЛИОТЕК
1/4887/91.40

## ЗМЕСТ

Мая жалейка .................... 3
Бярозавы лісток .................... 4
Куст язміну .................... 5
На начлезе .................... 6
На ўскраі вёскі .................... 8
Сінічка-сястрычка .................... 9
Качаня .................... 10
Дзіма і цёця Валя .................... 12
Два мастакі .................... 14
Сабачка Мікі .................... 16
Хацелася б мне... .................... 17
Шпак і парэчка .................... 18
Муха-крадзюха .................... 20
Мамаратнік .................... 21
Дзядулевы згадкі .................... 22
Дзве маці .................... 24
Блізняткі .................... 26
Зімовы вецер .................... 28
Сорочынка .................... 29



**Прыходзька П.**

П85 Бярозавы лісток: Вершы: Для малод. шк. узросту / Пятро Прыходзька; Маст. У. І. Сытчанка.— Мн.: Маст. літ., 2004.— 31 с.: іл.

ISBN 985-02-0689-6.

Новую кнігу лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, паэта Пятра Прыходзькі складаюць вершы пра любоў да роднага краю, пра яго цудоўную непаўторную прыроду. Многія творы маюць выхаваўчае значэнне.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-5**

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**ПРЫХОДЗЬКА** Пётр Фёдаравіч

**БЯРОЗАВЫ ЛІСТОК**

*Вершы*

Рэдактар *У. М. Мазго*
Мастацкі рэдактар *В. А. Макаранка*
Тэхнічны рэдактар *Т. С. Звяркові*ч
Стылістычныя рэдактары *Д. Р. Лосік, М. Ч. Пермякова*

Падпісана да друку 05.05.04. Фармат $70x100^1/_{16}$. Папера афсетная № 1. Гарнітура Школьная. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 2,6. Улік.-выд. арк. 2,20. Тыраж 1500 экз. Заказ 217.

Выдавецкае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія № 02330/0056778 ад 17.02.2004. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку». 220024, Мінск, вул. Каржанеўскага, 20.



ISBN 985-02-0689-6
9799850206892 >